Радыё Свабода

ПАЛІТЫКА

Кожныя прэзыдэнцкія выбары — «каляровая рэвалюцыя». Раўкоў пра 6 спробаў «дэмантажу сувэрэнітэту»

05 жнівень 2020, 09:33

Дзяржсакратар Савету бясьпекі Андрэй Раўкоў заявіў, што найноўшая гісторыя Беларусі памятае як мінімум шэсьць спробаў «каляровых рэвалюцый».

Пачынаючы ад 1994 году, ніводная значная выбарчая кампанія ў Беларусі не абыходзілася бяз вонкавага ўмяшаньня, напісаў Раўкоў у Facebook.

«Найноўшая гісторыя нашай краіны памятае як мінімум шэсьць спробаў каляровых рэвалюцый, — падлічыў Раўкоў. — Гэта выснова не прыдуманая ў калідорах улады, а зробленая навукоўцамі — навукова-дасьледчая праца праводзілася ў БДУ».

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Дзьмітрыеў: Савет бясьпекі можа адключыць інтэрнэт у выпадку «пагрозы бясьпецы дзяржавы»

Паводле Раўкова, падобныя працэсы працягваюцца, хоць у больш удасканаленых, нярэдка закамуфляваных формах.

«Так званая „трансфармацыя“ мае на ўвазе дэмантаж сувэрэнітэту Беларусі праз зьмяненьне грамадзкай сьвядомасьці, каштоўнаснай базы і дыскрэдытацыю органаў кіраваньня. Асноўнымі драйвэрамі ў гэтым — вонкава непалітызаваныя структуры, недзяржаўныя СМІ, блогасфэра і сацсеткі. Іх выкарыстаньне для масавага „прамываньня мазгоў“ ператварылася ў вырашальны фактар канфліктаў і сацыяльных узрушэньняў. Нельга на гэта паддацца», — піша дзяржсакратар.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Пасланьне за 4 дні да выбараў. Што Лукашэнка сказаў прыхільнікам і чым пагражаў «альтэрнатыўшчыкам». Сьцісла

Напярэдадні пра «каляровыя рэвалюцыі» ў сваім пасланьні народу і парлямэнту гаварыў Аляксандар Лукашэнка. Па яго звестках, цэлая армія інтэрнэт-троляў і інфармацыйных правакатараў працуе дзень і ноч, каб дэстабілізаваць сытуацыю ў краіне.

Прэзыдэнцкія выбары — 2020 у Беларусі. Што важна ведаць

- Шостыя ў гісторыі сувэрэннай Беларусі выбары прэзыдэнта прызначаныя на нядзелю, **9 жніўня 2020 году**.
- 65-гадовы **Аляксандар Лукашэнка** кіруе дзяржавай 25 гадоў. Ніводныя прэзыдэнцкія выбары (2001, 2006, 2010, 2015), апроч першых (1994 год), не прызналі свабоднымі і справядлівымі на міжнародным узроўні.
- Старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына** адхіліла прапановы праваабаронцаў аб дыстанцыйных прэзыдэнцкіх выбарах у час эпідэміі COVID-19, бо «часу для прыняцьця гэтых захадаў ужо няма». Лукашэнка ня бачыў падставаў пераносіць выбары праз пандэмію.
- ЦВК зарэгістраваў 15 ініцыятыўных груп з 55 заявак.
- Аўтару YouTube-канала «Страна для жизни» **Сяргею Ціханоўскаму** Цэнтральная выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, бо ён адбываў 15 сутак арышту і ня мог асабіста падаць дакумэнты. Тады сваю ініцыятыўную групу ў ЦВК заявіла жонка блогера **Сьвятлана Ціханоўская**.

- 29 траўня на перадвыбарчым пікеце жонкі затрымалі Ціханоўскага і яшчэ 9 чалавек. Лукашэнка казаў пра акалічнасьці затрыманьня за 4 гадзіны да таго, як яно адбылося.
- 11 чэрвеня ў «Белгазпрамбанку» і шэрагу іншых кампаній прайшлі ператрусы. У Камітэце дзяржкантролю заявілі, што завялі крымінальныя справы аб легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, і аб ухіленьні ад сплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Старшыня КДК **Іван Тэртэль** сьцьвярджаў, што да гэтых спраў мае дачыненьне патэнцыйны кандыдат у прэзыдэнты **Віктар Бабарыка**. Роўна за 4 гадзіны да заявы Дзяржкантролю **Аляксандар Лукашэнка** расказаў пра акалічнасьці «справы „Белгазпрамбанку“».
- 18 чэрвеня Віктара Бабарыку і яго сына, кіраўніка ініцыятыўнай групы Эдуарда Бабарыку затрымалі.
- 14 ліпеня ЦВК зарэгістраваў кандыдатамі ў прэзыдэнты **Аляксандра Лукашэнку**, **Сьвятлану Ціханоўскую**, **Ганну Канапацкую**, **Андрэя Дзьмітрыева** і **Сяргея Чэрачня**. Не зарэгістравалі **Віктара Бабарыку** і **Валера Цапкалу**.
- Ад пачатку выбарчай кампаніі праваабаронцы налічылі больш за 1300 затрыманых: удзельнікі «ланцугоў салідарнасьці», сябры ініцыятыўных груп, актывісты, палітыкі, блогеры, журналісты і проста мінакі на вуліцы. Сотні чалавек пакаралі адміністрацыйнымі арыштамі і аштрафавалі.